# Берасцейскія кнігазборы



БРЭСЦКІ АБЛАСНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
БРЭСЦКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя М. ГОРКАГА

# Берасцейскія кнігазборы

## праблемы і перспектывы даследавання

Матэрыялы і даклады
III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі

Брэст, 22—25 верасня 2015 года

Пад агульнай рэдакцыяй
доктара філалагічных навук
М. В. Нікалаева

Мінск
2016

УДК 002.2(476.7)(061.3)
ББК 76.116(4Беі)я431
Б 48

**Пад агульнай рэдакцыяй доктара філалагічных навук М. В. Нікалаева**

**Складальнік**
А. М. Мяснянкіна — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага

**Рэдакцыйная калегія**:
Т. П. Данілюк — дырэктар Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага,
Т. С. Кавенька — загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага,
С. Лучак — консул Генеральнага консульства Рэспублікі Польшча ў г. Брэсце,
А. І. Мысык — Генеральны консул Украіны ў г. Брэсце,
А. М. Мяснянкіна — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага,
М. В. Нікалаеў — доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкай кнігі Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі

Б48 **Берасцейскія кнігазборы**: праблемы і перспектывы даследавання : матэрыялы і даклады III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 22—25 верасня 2015 г. / Брэсцкі абласны выканаўчы камітэт, Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага ; [склад. А. М. Мяснянкіна] ; пад агул. рэд. М. В. Нікалаева. — Мінск : БудМедыяПраект, 2016. — 440 с. : іл.

ISBN 978-985-7091-86-7.

Зборнік працягвае традыцыю публікацыі дакладаў, прачытаных на Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 22—25 верасня 2015 г.). Аўтары з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны прадстаўляюць вынікі даследаванняў гісторыі кніжнай культуры. Значная ўвага надаецца кніжным старажытнасцям Брэстчыны, лёсу мясцовых архіваў і бібліятэк. Асаблівае месца займаюць матэрыялы, прысвечаныя сучасным праблемам кнігавыдання, гісторыі мастацтва рэгіёна.

Зборнік адрасаваны шырокаму колу карыстальнікаў: гісторыкам, культуролагам, кнігазнаўцам, бібліёграфам. Можа быць карысны для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і духоўнай спадчынай беларускага народа.

**УДК 002.2(476.7)(061.3)**
**ББК 76.116(4Беі)я431**

**ISBN 978-985-7091-86-7**

© Складальнік А. М. Мяснянкіна, 2016
© Дызайн і макет Г. І. Мацур, 2016
© М. В. Нікалаеў, 2016

*Вабішчэвіч А. М.*

# Рэлігійны друк у Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.)



У беларускай савецкай гістарычнай навуцы заходнебеларускі рэлігійны друк 1920—1930-х гг. не быў прадметам спецыяльнага даследавання — атэістычная дзяржаўная палітыка выключала магчымасць распрацоўкі такой праблематыкі. Акрамя таго, быў абмежаваны доступ да рэлігійных выданняў, якія знаходзіліся ў спецсховішчах вядучых бібліятэк рэспублікі. Не былі закрануты рэлігійныя часопісы і газеты ў манаграфіі С. Говіна, прысвечанай друку Заходняй Беларусі[1]. Заходнебеларускія перыядычныя выданні разглядаліся польскім даследчыкам А. Пачкоўскім толькі ў кантэксце агульнага становішча прэсы міжваеннай Польшчы[2]. Хоць на сучасным этапе развіцця айчыннай гістарычнай навукі ўжо многія аспекты рэлігійнага жыцця Заходняй Беларусі знайшлі адлюстраванне ў шэрагу дысертацый, манаграфій, артыкулаў, аднак пакуль яшчэ няма комплекснага даследавання аб рэлігійным друку. У кнізе ўжо згаданага С. Говіна заходнебеларускія выданні прадстаўлены ў агульным рэчышчы канфесійнага друку Беларусі[3]. Палітыку польскіх

1 *Говін С. В.* Друк Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Мінск, 1974. 95 с.

2 *Paczkowski A.* Prasa Drugiej Rzeczypospolitej 1918—1939. Warszawa, 1971. 489 s. ; *Idem*. Prasa polska w latach 1918—1939. Warszawa, 1980. 535 s.

3 *Говін С. В.* Канфесійны друк у Беларусі : вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў факультэта журналістыкі спецыяльнасці 1—23 01 08 «Журналістыка (на напрамках)». Мінск, 2008. 288 с.

улад да беларускага перыядычнага друку вывучалі А. Вабішчэвіч, А. Загідулін, В. Каранеўская і іншыя даследчыкі[4]. Цяпер рэлігійны друк разглядаецца як важная частка беларускай хрысціянскай грамадска-царкоўнай дзейнасці[5]. Спроба абагуленага аналізу заходнебеларускага кнігадрукавання і бібліятэчнай справы здзейснена Р. Матульскім[6]. У цяперашняй польскай гістарычнай навуцы акцэнт робіцца на ролі прэсы ў палітычнай сістэме Польскай дзяржавы ў 1918—1939 гг.[7] Менавіта таму варта зрабіць агляд друку розных канфесій (у тым ліку і нехрысціянскіх) заходнебеларускага рэгіёна ў складзе Польскай дзяржавы.

Праваслаўнае насельніцтва Заходняй Беларусі было ахоплена Віленскай, Гродзенскай і Пінскай епархіямі, на тэрыторыі якіх налічвалася каля 500 прыходскіх цэркваў, 5 манастыроў, духоўная семінарыя ў Вільні, выдавалася рэлігійная літаратура на рускай, беларускай, украінскай і польскай мовах. У заходнебеларускім рэгіёне распаўсюджваліся рускамоўныя выданні (як свецкія, так і рэлігійныя) — газеты: «Русский голос» (Львоў), «Наше время» (Вільня), «Новая искра» (Вільня), «Русское слово» (Варшава), часопіс «Воскресное чтение» (Варшава), праваслаўная газета «Слово» (Варшава) і інш. Агульная іх

4 *Вабішчэвіч А. М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Брэст, 2008. 319 с. ; *Загідулін А. М.* Беларускае пытанне ў польскай нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Заходняй Беларусі (1921—1939 гг.). Гродна, 2010. 183 с. ; *Каранеўская В. У.* Палітыка ўрада II Рэчы Паспалітай у адносінах да друку нацыянальных меншасцей (1921—1926) // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. 2000. № 2. С. 56—61 ; *Яе ж.* Умовы развіцця беларускага перыядычнага друку ў міжваеннай Польшчы (1921—1939 гг.) // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 2. С. 47—50.

5 Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX ст.). Мінск, 1998. 340 с. ; *Кулажанка Л.* З вопыту асветніцкага служэння Праваслаўнай царквы (Заходняя Беларусь: 1920—30-я гг.) // Праваслаўе. 1999. № 8. С. 38—57 ; *Трацяк І. І.* Біблія ў кантэксце беларускай культуры. Гродна, 2003. 99 с. ; *Вабішчэвіч А. М.* Грамадска-царкоўны праваслаўны рух на тэрыторыі Заходняй Беларусі (20—30-я гг. XX ст.) // Дабраверны князь Канстанцін (Васілій) Астрожскі — славуты асветнік і абаронца Праваслаўя : зборнік матэрыялаў Міжнароднай навукова-багаслоўскай канферэнцыі, Тураў — Брэст, 11—12 мая 2008 г. Брэст, 2011. С. 160—172 ; *Трацяк І. І.* Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі. Гродна, 2013. 267 с.

6 *Мотульский Р. С.* Книгопечатание и библиотечное дело в западных регионах Беларуси в 1921—1939 гг. // Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання : матэрыялы і даклады II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, Брэст, 31 мая — 3 чэрвеня 2012 г. Брэст, 2013. С. 92—116.

7 *Mielczarek T.* Prasa w systemie politycznym Drugiej Rzeczypospolitej (1918—1939). Sosnowiec, 2009. 137 s. ; *Habielski R.* Wolność czy odpowiedzialność?: prasa i polityka w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 2013. 270 s.

колькасць у міжваеннай Польшчы пераўзыходзіла лічбу 30. Паводле ўспамінаў ураджэнца м. Чаромха Бельскага павета Д. Шатыловіча, яго бацька пасля набыцця газеты «Русское слово» наладжваў у нядзелю, у прысутнасці суседзяў, яе чытанне і абмеркаванне[8]. Нягледзячы на нізкі ўзровень матэрыяльнага дастатку, у заходнебеларускіх вёсках пісьменныя сяляне, праваслаўнае духавенства чыталі даступную рускамоўную літаратуру[9].

З-за слабасці беларускага праваслаўнага грамадска-царкоўнага руху нешматлікімі былі беларускамоўныя выданні для праваслаўнага насельніцтва. З 69 беларускамоўных рэлігійных кніг 1921—1939 гг. выданняў праваслаўнага характару было толькі 6[10]. Гэта падручнікі, падрыхтаваныя прадстаўніком свецкай інтэлігенцыі С. Паўловічам — «Свяшчэнная гісторыя Старога Завету» (1926), «Першая навука Закону Божага» (1935), «Свяшчэнная гісторыя Новага Завету» (1936) і інш., выкарыстанне якіх было адобрана царкоўнымі ўладамі. Пад рэдакцыяй С. Паўловіча быў надрукаваны ў 1933 г. «Праваслаўны малітваслоў» на царкоўнаславянскай і беларускай мовах. Па рэкамендацыі спецыяльнай камісіі ў 1936 г. былі надрукаваны ў Варшаве апрацаваныя С. Паўловічам «Свяшчэнная гісторыя Новага Завету» і другое выданне «Першай навукі Закону Божага»[11].



Некалькі перыядычных выданняў былі звязаны з арганізацыйным станаўленнем праваслаўнага грамадска-царкоўнага руху. Так, па ініцыятыве прадстаўнікоў Беларускага пасольскага клуба (асабліва сенатара В. Багдановіча) у лютым — снежні 1925 г. у Варшаве выдаваўся грамадска-царкоўны часопіс «Праваслаўны беларус», рэдактарам якога з'яўляўся Я. Пачопка, а мастацкае афармленне выканаў Я. Драздовіч. Галоўнае значэнне на старонках выдання надавалася адраджэнню і ўмацаванню духоўнасці. Там змяшчаліся матэрыялы па гісторыі, грамадска-палітычным, культурным і рэлігійным жыцці Заходняй Беларусі.

---

8 У новай айчыне: штодзённае жыццё беларусаў Беласточчыны ў міжваенны перыяд. Беласток, 2001. С. 272.

9 Запісы ўспамінаў Новіка А. А. (1920—2008 гг.), жыхара в. Еськавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл., Пашкевіч К. П. (1924 г. нар.), жыхаркі в. Рубель Столінскага р-на Брэсцкай вобл. // Прыватны архіў А. М. Вабішчэвіча ; У новай айчыне … С. 221 ; *Калеснік У.* Доўг памяці. Брэст, 2005. С. 50—51.

10 *Turonek E.* Książka białoruska w II Rzeczypospolitej, 1921—1939. Warszawa, 2000. S. 37.

11 *Вабішчэвіч А. М.* Грамадская і навукова-педагагічная дзейнасць Сяргея Паўловіча // Праваслаўе. 2006. № 14—15. С. 104—109.

Намаганнямі сенатараў В. Багдановіча і А. Назарэўскага, групы беларускіх духоўных і свецкіх асоб на працягу 1927—1930 гг. у Вільні дзейнічала Праваслаўнае беларускае дэмакратычнае аб'яднанне (ПБДА), якое выступала ў абарону рэлігійных, нацыянальна-культурных, грамадска-палітычных і іншых інтарэсаў беларускага насельніцтва. Ідэйным лідарам БПДА з'яўляўся якраз В. Багдановіч — лідэр «старацаркоўнікаў». Аб'яднанне выступала за ўвядзенне беларускай мовы ў пропаведзях, пры вывучэнні Закону Божага, дамагалася ўладкавання царквы на прынцыпах саборнасці, прыцягнення да вырашэння пытанняў царкоўнага жыцця міранаў. Хоць за царквой прызнавалася адно з галоўных месцаў у жыцці грамадства, аднак хрысціянскія каштоўнасці разглядаліся ў цеснай сувязі з нацыянальна-культурнымі, а грамадскім праблемам надавалася больш увагі, чым царкоўным пытанням. Аб'яднанне часам знаходзілася ў апазіцыі як да польскіх дзяржаўных улад, так і праваслаўных іерархаў. ПБДА не прызнавала аўтакефалію Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, выступала за захаванне яе кананічнай залежнасці ад Рускай Праваслаўнай Царквы[12]. Друкаваным органам ПБДА з'яўляўся часопіс «Праваслаўная Беларусь» (1927—1928 гг.). На старонках гэтага выдання былі змешчаны ўспаміны В. Багдановіча пра яго ўдзел у пасяджэннях Памеснага Сабору Рускай Праваслаўнай Царквы ў лістападзе 1917 г. у Маскве. Протаіерэй Л. Голад (у пачатку 1920-х гг. праводзіў богаслужэнні ў Свята-Пакроўскім саборы ў Гродна), выдавец-рэдактар часопіса, разам з іншымі актывістамі грамадска-царкоўнага руху выступаў у падтрымку захавання царкоўнаславянскай мовы «як аднаго са сродкаў культурнага развіцця беларускай мовы»[13].

Яшчэ адным органам ПБДА стаў часопіс «Народная ніва» (быў выдадзены ў студзені 1928 г. усяго адзін нумар), рэдактарам якога з'яўляўся святар А. Коўш. У рэдакцыйным звароце да чытачоў галоўным лозунгам было абвешчана аб'яднанне беларускага, рускага і ўкраінскага насельніцтва ў Польшчы, што сведчыла аб намерах стварыць блок нацыянальных меншасцей напярэдадні парламенцкіх выбараў (адбыліся ў сакавіку 1928 г.). Менавіта ва ўмовах узаемнай падтрымкі і павагі рэлігійная культура лічылася падставай для паўнацэннага нацыянальнага развіцця беларусаў, рускіх і ўкраінцаў[14]. Усе публікацыі часопіса былі на трох мовах — беларускай, рускай і ўкраінскай. У ар-

12 Праваслаўная Беларусь. № 5. 1927. С. 6.

13 *Голад Л.* Нацыянальная мова ў праваслаўнай царкве // Праваслаўная Беларусь. 1927. № 1. С. 8.

14 Народная ніва. № 1. 1928. С. 17.

тыкуле А. Каўша «Духавенства і палітыка» адзначалася, што асновай дзейнасці святароў павінны стаць евангельскія ісціны чалавекалюбства, дапамогі слабым і прыгнечаным. Рэдакцыя выдання адстойвала прынцыпы сабарнасці царквы, выступала за скліканне краёвага сабору Праваслаўнай Царквы ў Польшчы[15]. На старонках часопіса быў змешчаны артыкул «Духавенства і народ» скандальнага архімандрыта Ф. Марозава.

У ПБДА вызначылася больш радыкальная група А. Каўша, якая ў верасні 1928 г. — красавіку 1929 г. выдавала ў Вільні часопіс «Беларуская зарніца», дзе дэкларавалася пераадоленне адчужэння праваслаўнай царквы ад нацыянальна-культурных інтарэсаў[16]. Праваслаўная праблематыка на старонках часопіса падавалася як у рэлігійным, так і грамадскім, гістарычным кантэксце. У шэрагу публікацый аналізаваўся стан хрысціянскіх цэркваў, міжканфесійныя і царкоўна-дзяржаўныя адносіны, рэлігійнае выхаванне моладзі, гісторыя праваслаўнай канфесіі ў Беларусі, помнікі рэлігіі і культуры.

Часовае ажыўленне беларускага грамадска-царкоўнага руху назіралася ў пачатку 1930-х гг. Планавалася легалізаваць новую грамадскую арганізацыю і стварыць сетку яе філіялаў у прыходах[17]. Сярод асноўных задач новай грамадскай арганізацыі — Цэнтральнага Беларускага праваслаўнага камітэта (ЦБПК), яго друкаванага органа — часопіса «Сьветач Беларусі» (1930—1933, 1936 гг.) — былі дэрусіфікацыя і беларусізацыя праваслаўнай семінарыі ў Вільні, увядзенне беларускай мовы ў пропаведзях, пры выкладанні Закону Божага, ва ўзаемаадносінах вернікаў[18]. Галоўнымі задачамі выдання былі прызнаны «паглыбленне і ўмацаванне рэлігійнай свядомасці праваслаўных беларусаў праз беларусізацыю царквы»[19].

Хоць Беларускі нацыянальны камітэт у Вільні ў пачатку 1930-х гг. таксама выступаў з патрабаваннямі беларусізацыі грамадска-царкоўнага жыцця, аднак адмовіўся ад ранейшай канфрантацыйнай тактыкі ва ўзаемаадносінах з царкоўнымі ўладамі. Яго памяркоўная пазіцыя была прадстаўлена ў трох нумарах «Голаса праваслаўнага беларуса», які

15 Там жа. С. 4, 16.

16 *Латоцкі А.* Нацыянальны элемент у хрысціянстве // Беларуская зарніца. 1928. № 4. С. 3—4.

17 Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Ф. 3. Воп. 1. Спр. 282. Арк. 10, 20—21.

18 Там жа. Спр. 198. Арк. 13, 20—21.

19 Сьветач Беларусі. № 1 (8). 1933. С. 6.

выдаваўся ў Вільні ў 1931—1932 гг. «Трэба рашуча і неадкладна стаць на шлях адраджэння царкоўнага жыцця»[20], — такі гучны заклік павінен быў засведчыць пазіцыю згодніцкага крыла, якое пайшло на цеснае супрацоўніцтва з польскімі адміністрацыйнымі ўладамі, але не атрымала грамадскай падтрымкі. Адзін з лідараў «беларускай санацыі» — Р. Астроўскі — усяляк імкнуўся дыскрэдытаваць А. Каўша[21]. Больш радыкальнае стаўленне адносна беларусізацыі займала праваслаўная фракцыя Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД)[22], якая выдавала ў 1932—1933 гг. часопіс «Царква і народ», рэдактарам якога з'яўляўся І. Балтручак, выдаўцом — Я. Красоўскі. Гэты часопіс настойліва абараняў інтарэсы праваслаўнага веравызнання, выступаў за беларусізацыю Праваслаўнай Царквы, супраць атэістычнага светапогляду. Асобныя матэрыялы мелі выразны апазіцыйны характар адносна царкоўнай адміністрацыі. У прыватнасці, быў надрукаваны мемарандум беларускай праваслаўнай групы студэнтаў Віленскага ўніверсітэта імя С. Баторыя да мітрапаліта Дыянісія, у якім утрымлівалася просьба зрабіць кадравыя змены ў кіраўніцтве Віленскай епархіі[23].

Арыгінальным быў дзіцячы царкоўны, культурна-асветніцкі ілюстраваны часопіс «Снапок» (рэдактар С. Паўловіч), які з мая 1937 г. да верасня 1939 г. выдаваўся ў Варшаве. Усяго выйшла 10 нумароў часопіса. Дзеці мелі магчымасць пачытаць пра многія культурныя здабыткі і знакамітых асветнікаў — віленскіх пакутнікаў Іаана, Антонія, Яўстахія (№ 1), пачынальнікаў пісьменнасці — святых Кірыла і Мяфодзія (№ 3), Ефрасінню Полацкую (№ 6); пра Каложскую (Барысаглебскую) царкву ў Гродна (№ 7—8). Знаёмілі дзяцей таксама і з асобнымі каштоўнасцямі сусветнай культуры. Часопіс быў своеасаблівым дзіцячым календаром прыроды. На яго старонках змяшчаліся вершы, жарты, прыказкі, прымаўкі, загадкі, скарагаворкі і інш.[24]

Аднак з сярэдзіны 1930-х гг. ва ўмовах уцягвання Праваслаўнай Царквы ў Польшчы ў правядзенне дэрусіфікацыі і паланізацыі захады аб беларусізацыі царкоўнага жыцця станавіліся безвыніковымі. Для тэарэтыка-ідэалагічнага забеспячэння ў Гродна быў створаны

20 Голас праваслаўнага беларуса. № 1. 1931. С. 16.

21 *Горны А.* Протаіерэй Аляксандр Коўш: вяртанне з забыцця // Гродненские епархиальные ведомости. 2011. № 11. С. 16.

22 *Станкевіч А.* Беларускі хрысціянскі рух : гістарычны нарыс. Вільня, 1939. С. 210.

23 Царква і народ. № 1. 1932. С. 7—14.

24 *Вабішчэвіч А.* Настаўнік: навукова-педагагічная дзейнасць Сяргея Паўловіча // Пачатковая школа. 1996. № 9. С. 47—48.

Праваслаўны навукова-выдавецкі інстытут, адной з асноўных задач якога была дэкларавана прапаганда супрацоўніцтва праваслаўных з Польскай дзяржавай, палякамі і іх культурай[25]. Аналіз польскамоўнай перыёдыкі Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута — часопісаў «Głos Prawosławia» («Голас праваслаўя»), «Przegląd prawosławny» («Праваслаўны агляд»), «Dwutygodnik prawosławny» («Праваслаўны двухтыднёвік»), эпізадычных выданняў (пераважна брашур) — сведчыць аб іх слабым навукова-тэарэтычным узроўні, русафобскім і паланафільскім змесце.

Асобна праводзілі рэлігійна-асветніцкую працу стараабраднікі-беспапоўцы. На іх І Усяпольскім з'ездзе ў Вільні 15—17 кастрычніка 1925 г. выказвалася ўпэўненасць у «сумленным, лаяльным і пакорным выкананні грамадзянскіх абавязкаў»[26]. Быў утвораны асобны Вышэйшы стараабрадніцкі савет у Польшчы (ВСС) на чале з А. Піманавым. Вынікі арганізацыйнай працы ВСС падвёў ІІ Усяпольскі стараабрадніцкі з'езд (сабор) у Вільні 15—16 кастрычніка 1930 г.[27] Друкаваным органам арганізацыі быў зацверджаны часопіс «Вестник Высшего Старообрядческого Совета в Польше», рэдакцыйную раду якога ўзначальваў А. Піманаў.



Нягледзячы на канстытуцыйную роўнасць рэлігій, Рымска-каталіцкая царква мела фактычна статус дзяржаўнай у міжваеннай Польшчы. У пачатку 1937 г. на заходнебеларускіх землях дзейнічала 5 480 парафій. Для рэлігійна-асветніцкай працы выкарыстоўваліся шматлікія каталіцкія перыядычныя выданні — пераважна польскамоўныя газеты і часопісы: у сярэдзіне 1930-х гг. у Польшчы іх налічвалася каля 300 з агульным штодзённым тыражом 1 млн экз.[28] Акрамя афіцыйных царкоўных выданняў — «Piński przegląd diecezjalny» («Агляд Пінскай дыяцэзіі»), «Wiadomości archidiecezjalne wileńskie» («Ведамасці Віленскай архідыяцэзіі») — распаўсюджваліся таксама «Nowe życie» («Новае жыццё»), «Słowo» («Слова»), «Gazeta kartuzka» («Картузская газета»), «Dziennik wileński» («Віленскі дзённік»), «Nasz przyjaciel» («Наш прыяцель») і інш.

Супраць паланізацыі, у абарону хрысціянскіх і нацыянальных каштоўнасцей выступілі прадстаўнікі беларускага каталіцкага руху.

---

25 Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Ф. 92. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 20 ; Przegląd Prawosławny. № 1. 1939. S. 3.

26 LCVA (Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas). F. 1681. Ap. 1. B. 414. L. 14.

27 Ibid. B. 59. L. 180.

28 *Мараш Я. Н.* Политика Ватикана и католической церкви в Западной Белоруссии (1918—1939 гг.). Минск, 1983. С. 62.

Сярод беларускага каталіцкага насельніцтва папулярнасцю карысталася газета «Крыніца» (заснавана яшчэ ў кастрычніку 1917 г. у Петраградзе), якая выдавалася ў Вільні з невялікім перапынкам да ліпеня 1940 г. У 1925—1937 гг. газета называлася «Беларуская крыніца» («Biełaruskaja krynica»). Лідар БХД А. Станкевіч заснаваў у Вільні Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны, Беларускае каталіцкае выдавецтва, дзе сярод шэрага выданняў у 1930-я гг. былі надрукаваны па-беларуску кнігі біблейскай гісторыі В. Гадлеўскага, яго пераклад Новага Запавету Бібліі. А. Станкевіч з'яўляўся таксама рэдактарам і выдаўцом каталіцкага грамадска-асветніцкага часопіса «Хрысціянская думка» («Chryścijanskaja Dumka», 1928—1939 гг.), які адстойваў хрысціянска-дэмакратычныя каштоўнасці, выступаў за абуджэнне ў беларусаў-католікаў рэлігійнай і нацыянальнай свядомасці[29]. На старонках часопіса былі не толькі багаслоўскія матэрыялы, але і філасофскія, культуралагічныя артыкулы, нарысы А. Станкевіча, П. Татарыновіча, Я. Тарасевіча, В. Шутовіча і іншых аўтараў. У выданні друкаваліся працы А. Станкевіча «Родная мова ў святынях», «Магнушэўскі — Паўлюк Багрым — Баброўскі: да вытокаў беларускага адраджэння», «Беларускі хрысціянскі рух», «У чэсць 950-годдзя хросту Беларусі», «Хрысціянства і беларускі народ» і інш. Рэдакцыя часопіса выступала за беларусізацыю Каталіцкай царквы ў Заходняй Беларусі, актыўны ўдзел ксяндзоў і вернікаў у беларускім хрысціянска-дэмакратычным руху. У 1938—1939 гг. у Вільні выдаваўся лацінкай беларускі дзіцячы часопіс «Зорка»[30].

З пачатку 1920-х гг. у заходнебеларускім рэгіёне рабіліся спробы аднаўлення традыцый уніяцкай царквы. Паводле розных ацэнак, колькасць вернікаў-уніятаў на працягу 1924—1939 гг. вагалася ад 7,7 да 24 тыс. чалавек. Найбольшага ўздыму кампанія неаўніі дасягнула ў канцы

1920-х — пачатку 1930-х гг. місіянерскія цэнтры, уніяцкія кляштары і храмы актыўна праводзілі культурна-асветніцкую дабрачынную дзейнасць, хаця не змаглі спаўна задаволіць нацыянальна-культурныя інтарэсы беларускага насельніцтва. Адзін з актыўных дзеячаў неаўніі А. Неманцэвіч у 1932—1937 гг. выдаваў у Вільні ўніяцкую газету «Да

29 Да арганізацыі! // Chryścijanskaja Dumka. 1932. № 2. С. 1—2.

30 *Вабішчэвіч А. М.* Хрысціянская думка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Мінск, 2003. Т. 6, кн. 2. С. 86—87.

злучэння» («Do złuczenia»), а пасля яе закрыцця наладзіў у 1939 г. у Варшаве выданне часопіса «Злучэнне» («Złuczenie»).

Паступова распаўсюджваў свой уплыў у Заходняй Беларусі пратэстантызм. Самымі шматлікімі былі баптысты, евангельскія хрысціяне (пяцідзясятнікі), метадысты і іншыя. Пры падтрымцы замежных місіянерскіх цэнтраў неапратэстанцкія дэнамінацыі асабліва актывізаваліся ў Палескім ваяводстве. Аб'яднанне цэркваў хрыстовых евангельскага веравызнання выдавала ў Кобрыне часопіс «Христианский союз». Намаганнямі баптысцкага прапаведніка Л. Дзекуць-Малея Брэст стаў значным цэнтрам евангельскага руху. Гэты баптысцкі прапаведнік прымаў непасрэдны ўдзел у беларускамоўным перакладзе брашур (толькі на працягу 1920—1924 гг. іх было падрыхтавана 17), Новага Запавету Бібліі, які выдаваўся ў 1926—1930 гг. асобнымі часткамі[31]. А. Луцкевіч для выдання па-беларуску ў Лодзі ў 1931 г. «Новага Запавету і псалмоў» выкарыстоўваў пераклад Л. Дзекуць-Малея.

У 1920-я гг. нязначная частка беларускай інтэлігенцыі разглядала пратэстантызм у якасці нацыянальнай альтэрнатывы «польскаму каталіцызму» і «рускаму праваслаўю». У 1924 г. праз І. Ляўковіча (Г. Леўчыка), які быў сакратаром амерыканскага камітэта метадыстаў у Варшаве, былі наладжаны кантакты царквы метадыстаў з беларускай інтэлігенцыяй у Вільні. Метадысты аказвалі матэрыяльную дапамогу Радашковіцкай і Клецкай беларускім гімназіям, Беларускаму інстытуту гаспадаркі і культуры. У лютым 1929 г. у Вільні быў выдадзены толькі адзін нумар выдання «Новы шлях», якое дэкларавалася ў якасці «незалежнага культурна-рэлігійнага часопіса». Рэдактарам выдання з'яўляўся прапаведнік С. Барткевіч, які з 1923 г. рэдагаваў ужо рускамоўны часопіс «Христианин», орган аб'яднанага Саюза евангельскіх хрысціян-баптыстаў. Як адзначалася на старонках часопіса «Новы шлях», царква метадыстаў павінна была аказаць дапамогу ў вырашэнні сацыяльных праблем (беднасці, беспрацоўя і інш.). Чытачоў заклікалі на набажэнствы ў абшчыны метадыстаў у Вільні, Слоніме, Радашковічах і іншых гарадах[32]. Пры падтрымцы метадыстаў прапаведнік у Дзярэчыне Я. Пятроўскі ў 1935 г. выдаваў і рэдагаваў беларускамоўны пратэстанцкі часопіс «Сьветач Хрыстусовае навукі».



---

31 *Глагоўска Х.* Дзейнасць Лукаша Дзекуць-Малея сярод баптыстаў на Палессі // Загароддзе-2 : матэрыялы навукова-краязнаўчай канферэнцыі «Палессе — скрыжаванне культур і часу», Пінск, 25—27 верасня 1999 г. Мінск, 2000. С. 34.

32 Новы шлях. № 1. 1929. С. 6, 8.

Трывалыя пазіцыі ў Заходняй Беларусі захоўваў іудаізм. Паводле вынікаў перапісу насельніцтва 1931 г. там налічвалася 505 тыс. іўдзеяў (9,9 % насельніцтва). Яўрэйскія ўстановы адукацыі і культуры захоўвалі нацыянальна-рэлігійную накіраванасць, што спрыяла захаванню самабытнасці яўрэяў і супрацьдзейнічала іх асіміляцыі[33]. Попыт яўрэйскай чытацкай аўдыторыі часткова задавальняўся агульнапольскімі і рэгіянальнымі перыядычнымі выданнямі на ідыш, а таксама на іўрыце і польскай мове. Яны мелі як рэлігійны, так і асабліва свецкі характар. У канцы 1930-х гг. штодзённы тыраж яўрэйскай прэсы ў Вільні (пераважна на ідыш) дасягаў 40 тыс. экз., а ўсяго ў Польшчы (разам з польскамоўнымі выданнямі) — да 300—350 тыс. экз. (паводле асобных падлікаў, у 1936 г. — да 450 тыс. экз.)[34]. Сярод іх вылучаліся сіяністская газета «Cajt» («Час»), артадаксальная «Das Wort» («Слова»), «Wilner Tog» («Дзень Вільні»), «Uncer Tog» («Наш дзень») і інш. Прыхільныя адносіны з боку ўрада знаходзіла яўрэйская польскамоўная перыёдыка[35], сярод якой вылучалася выданне сіяністскага напрамку «Nasz przegląd» («Наш агляд»).

Усяго на працягу 1920—1930-х гг. на заходнебеларускіх землях выдавалася не менш 40 рэгіянальных яўрэйскіх перыядычных выданняў. У папярэдніх завышаных падліках В. Каранеўскай — 60 выданняў[36] — не былі ўлічаны асобныя часопісы і газеты непасрэдна на тэрыторыі Заходняй Беларусі і адначасова ўведзены ў спіс яўрэйскі друк Вільні, Беластока, Ломжы. Яўрэйская перыёдыка выдавалася ў 10 заходнебеларускіх гарадах: у Брэсце — 13, Пінску — 8, Баранавічах — 4, Ваўкавыску, Гродна, Кобрыне і Лідзе — па 3, Навагрудку — 2, Слоніме і Глыбокім — па 1. Сярод іх вылучаліся «Poleser Tog» («Дзень Палесся»), «Bresker Vochnblat» («Брэсцкі штотыднёвік») «Pinsker Wort» («Пінскае слова»), «Pinsker Voch» («Пінскі тыдзень») і інш. Эпізадычныя яўрэйскія выданні друкаваліся таксама ў Пружанах, Лунінцы і некаторых іншых гарадах. Рэгіянальная яўрэйская перыёдыка ў Заходняй Беларусі вылучалася перавагай ідышамоўных выданняў, залежнасцю ад

33 *Вабішчэвіч А.* Культурна-асветніцкая дзейнасць яўрэяў-літвакоў у 20—30-я гг. XX ст. (на прыкладзе заходнебеларускага рэгіёна) // Białoruskie zeszyty historyczne. Białystok, 2006. № 25. S. 101.

34 *Paczkowski A.* Prasa polska w latach 1918—1939. S. 353.

35 *Fuks M.* Prasa żydowska w Polsce wydawana w języku polskim, jej rola i znaczenie w kształtowaniu stosunkow polsko-żydowskich (do 1939 r.) // Biuletyn Żydowskiego Instytutu Historycznego w Polsce. 1985. № 3—4. S. 137—143.

36 *Кореневская О.* Еврейская периодическая печать в Западной Беларуси в 1921—1939 гг. // Евреи Беларуси: история и культура. Минск, 2001. Вып. VI. С. 130.

ідэалагічнай арыентацыі і матэрыяльнай падтрымкі яўрэйскіх партый, грамадскіх аб'яднанняў, інфармацыйна-папулярным характарам газет, праяўленнем заснавальнікамі і друкарамі палітычнай лаяльнасці адносна Польскай дзяржавы. На старонках яўрэйскай прэсы змяшчалася разнастайная інфармацыя аб іудзейскіх святах, дзейнасці сінагог, бажніц, рэлігійна-асветніцкай дзейнасці і інш.

Уласную грамадска-рэлігійную дзейнасць разгортвалі мясцовыя татары-мусульмане. Цэнтральная рада культурна-асветніцкага саюза татар Польшчы (КАСТП), статут якога быў зацверджаны ў жніўні 1925 г., выдала ў 1932—1938 гг. тры тамы навуковага, літаратурнага часопіса «Rocznik Tatarski» («Татарскі штогоднік»), галоўным рэдактарам якога быў Л. Крычыньскі. У першых 2-х тамах «Татарскага штогодніка» змяшчаліся публікацыі па гісторыі, культуры татар на польскіх, беларускіх і літоўскіх землях, пра іх сувязі з мусульманскім Усходам; прыводзілася хроніка грамадска-палітычнага, рэлігійнага, этнакультурнага жыцця татар на заходнебеларускіх землях, у Польшчы; змяшчаліся літаратурныя творы, рэцэнзіі і інш. У 3-м томе была апублікавана кніга С. Крычыньскага «Літоўскія татары: Спроба гісторыка-этнаграфічнай манаграфіі»[37], дзе на падставе друкаваных матэрыялаў, архіўных дакументаў, рукапісаў, наратыўных крыніц прааналізавана гісторыя, рэлігія, традыцыйны ўклад, менталітэт татар, іх помнікі матэрыяльнай культуры, мова і літаратура, адукацыйныя ўстановы, могілкі (мізары) і інш. Матэрыяльную падтрымку для выдання «Татарскага штогодніка» аказвала Міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы Польшчы, польскі Фонд нацыянальнай культуры[38]. Напярэдадні верасня 1939 г. быў падрыхтаваны да друку 4-ы том[39], планавалася падрыхтоўка 5-га тома «Татарскага штогодніка».

Са студзеня 1934 г. Віленскі аддзел КАСТП пачаў выдаваць штомесячны часопіс «Życie tatarskie» («Татарскае жыццё»), галоўнай мэтай якога з'яўляўся ўздым культурнага ўзроўню вёскі[40]. На старонках выдання закраналіся пытанні гісторыі, рэлігіі, традыцыйных заняткаў

37 *Kryczyński S.* Tatarzy-litewscy: proba monografii historyczno-etnograficznej // Rocznik Tatarski. Warszawa, 1938. T. 3. XVI, 318 s.

38 *Вабішчэвіч А. М.* Грамадска-культурная дзейнасць татараў у Заходняй Беларусі ў 20—30-я гг. ХХ ст. // Веснік Гродзенскага дзяржанага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Серыя 1. Гісторыя, філасофія, паліталогія, сацыялогія. 2008. № 2 (67). С. 50.

39 *Miśkiewicz A.* Tatarzy polscy, 1918—1939. Życie społeczno-kulturalne i religijne. Warszawa, 1990. S. 133.

40 Kronika (15.05.1932—15.06.1935) // Rocznik Tatarski. Wilno, 1935. T. 2. S. 473.

татар, іх асветы, змяшчалася хроніка падзей грамадска-культурнага і рэлігійнага жыцця і г. д. Аднак інтарэс да часопіса з боку татарскага насельніцтва быў слабым, што тлумачылася найперш нізкім узроўнем яго матэрыяльнага дастатку. Толькі ў Вільні каля 13,6 % (у Варшаве — 6,6 %) мясцовых татар выпісвалі гэты часопіс, у іншых мясцовасцях гэты паказчык вагаўся ад 0,6 % да 3 %[41]. Цэнтральная рада КАСТП садзейнічала падпісцы і распаўсюджванню часопіса «Przegląd Islamski» («Ісламскі агляд»), які нерэгулярна выдаваўся мусульманскай абшчынай у Варшаве на працягу 1930—1937 гг.

У цэлым, характар рэлігійнага друку Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг. быў поліканфесійным, што звязвалася з суіснаваннем (не толькі мірным, але і даволі канфрантацыйным) розных хрысціянскіх і нехрысціянскіх канфесій. Таксама характэрнай рысай быў полілінгвізм (выдаваліся часопісы і газеты на розных мовах — беларускай, польскай, рускай, ідыш і інш.). З-за фінансавых цяжкасцей, адміністрацыйна-паліцэйскіх перашкод, унутраных супярэчнасцей і іншых прычын многія рэлігійныя выданні існавалі непрацяглы час ці з'яўляліся эпізадычнымі.

Цяпер заходнебеларуская рэлігійная перыёдыка раскідана па розных бібліятэках і архівах Беларусі і замежных краін, што ўскладняе яе вывучэнне (частка яе стала даступнай у апошні час, дзякуючы беларускай электроннай бібліятэцы «Электронная палічка»[42]). Аднак без дэталёвага даследавання гэтага пласта ўнікальнай друкаванай спадчыны немагчыма ўявіць паўнавартасную гісторыю канфесій Беларусі. Акрамя таго, усе гэтыя выданні, якія з'ўляюцца цяпер бібліяграфічнай рэдкасцю, трэба разглядаць у якасці самабытных культурных артэфактаў. Яны ўяўляюць цікаўнасць для культуролагаў, рэлігіязнаўцаў, бібліятэкараў, журналістаў. Іх вывучэнне неабходна для стварэння фундаментальнай гісторыі кнігадрукавання ў Беларусі.

41 *M.* Z życia Tatarów nowogródzkich // Życie tatarskie. 1938. № 2. S. 2.
42 URL: http://knihi.com/archivy.html (дата обращения: 24.02.2016).